# Беларуская Думка

№ 9 2020
ВЕРАСЕНЬ



Александр АНЖЕНКОВ
**МЕЛИОРАЦИЯ КАК ОБЪЕКТИВНАЯ НЕОБХОДИМОСТЬ**

Снежана МИХАЙЛОВСКАЯ
**ПРОГРАММЫ – СОЮЗНЫЕ, МАСШТАБЫ – КОСМИЧЕСКИЕ**




Леонид КРИВОНОС
**СТУПЕНИ УСПЕХА**

Виктор ЛОВГАЧ
**НАЙДЕШЬ ТЕНДЕНЦИЮ – ОБРЕТЕШЬ ПРЕДВИДЕНИЕ**



Сяргей ГАЛОЎКА
**ВІЛЕНСКАЯ ПАРТЫТУРА РЫГОРА ШЫРМЫ**

ISSN 0023-3102

ДЗЯРЖАЎНЫ ІНТАРЭС

Александр АНЖЕНКОВ.
МЕЛИОРАЦИЯ КАК ОБЪЕКТИВНАЯ НЕОБХОДИМОСТЬ ........ 3

ДОШКА ГОНАРУ

Леонид КРИВОНОС.
СТУПЕНИ УСПЕХА ........ 10

АБМЕРКАВАННЕ

БЕЛАРУСКАЯ ІНТЭЛІГЕНЦЫЯ Ў ВЫПРАБАВАННЯХ ЧАСУ ........ 16
Круглы стол у прэс-цэнтры БелТА

САЮЗНЫ ВЕКТАР

Снежана МИХАЙЛОВСКАЯ.
ПРОГРАММЫ – СОЮЗНЫЕ, МАСШТАБЫ – КОСМИЧЕСКИЕ ........ 20

КНІЖНЫ АГЛЯД ........ 27

ПА СЛЯДАХ КЛАСІКАЎ

Сяргей ГАЛОЎКА.
ВІЛЕНСКАЯ ПАРТЫТУРА РЫГОРА ШЫРМЫ ........ 28

ПРЭЗІДЭНЦКІЯ СТЫПЕНДЫЯТЫ

Виктор ЛОВГАЧ.
НАЙДЕШЬ ТЕНДЕНЦИЮ – ОБРЕТЕШЬ ПРЕДВИДЕНИЕ ........ 36

З МІНУЛАГА

Александр КАРАБЛИКОВ.
МАРИЯ-АЙШЕ КЕКСГОЛЬМСКАЯ ........ 42
Белорусский след в одной необычной судьбе

НАВУКОВАЯ БІБЛІЯТЭКА
ЧЫТАЛЬНАЯ ЗАЛА
ГрДУ імя Я. Купалы

ISSN 0023-3102

**«БЕЛАРУСКАЯ ДУМКА»**
ГРАМАДСКА-ПАЛІТЫЧНЫ
І НАВУКОВА-ПАПУЛЯРНЫ ЧАСОПІС

**Выдаецца з кастрычніка 1991 года**
**Выходзіць 1 раз у месяц**

**ЗАСНАВАЛЬНІК –**
АДМІНІСТРАЦЫЯ
ПРЭЗІДЭНТА РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ

**ВЫДАВЕЦ** – УП «БЕЛТА»
**Генеральны дырэктар УП «БЕЛТА»**
Ірына Барысаўна АКУЛОВІЧ

**Намеснік галоўнага рэдактара**
Таццяна ШАБЛЫКА

**Навукова-рэдакцыйны савет**
В.І. Бельскі, С.П. Вінакурава, А.Я. Гучок,
А.А. Каваленя (старшыня),
С.А. Кізіма, Ч.С. Кірвель, А.М. Косінец,
І.А. Марзалюк, У.А. Мельнік, М.У. Мясніковіч,
Д.Г. Ротман, І.В. Саверчанка,
І.А. Чарота, С.А. Шавель
Функцыі рэдакцыйнай калегіі
выконвае калегія УП «БЕЛТА»

**Адрас рэдакцыі**
220030, г. Мінск, вул. Энгельса, 30,
тэл.: 327-53-13, 327-55-33, тэл./факс: 289-19-55
e-mail: beldumka@belta.by
www.beldumka.belta.by
Юрыдычны адрас: 220030,
г. Мінск, вул. Кірава, 26
oper@belta.by

**Падпісныя індэксы**
74938 (індывідуальная падпіска)
749382 (ведамасная падпіска)

**Пасведчанне аб рэгістрацыі**
№ 6 ад 31 сакавіка 2009 г. Міністэрства
інфармацыі Рэспублікі Беларусь

**Дызайн, вёрстка**
Іван МІЦКЕВІЧ

**Рэдагаванне, карэктура**
Таіса БУТЭВІЧ

Фотакарэспандэнты «БЕЛТА»

Падпісана ў друк 18.09.2020.
Дата выхаду 25.09.2020.
Тыраж 2640 экз. Заказ 1102.

Цана свабодная.

Надрукавана ў друкарні «ГРАДЫЕНТ»®
ТАА «НАВІТЭХ». Ліцэнзія № 02330/482
ад 21.02.2017. Пасведчанне аб ДРВВРДВ
№ 2/194 ад 23.02.2017.
Вул. Бабушкіна, 6А, 220024, г. Мінск,
Рэспубліка Беларусь

© «Беларуская думка», 2020
© УП «БЕЛТА», 2020

## СЛОВА МАЛАДЫМ ВУЧОНЫМ

Роман МЕШКОВ.
Общинные праздники и дни памяти евреев Беларуси в конце XX – начале XXI века ........ 49

## ФІЛАСОФІЯ

Владимир КАЛМЫКОВ.
Фрагменты философского осмысления коронавирусной инфекции ........ 54

## ПАЛІТЫКА

Владимир ТЕРЕХОВ.
Как стать мировым лидером ........ 60

КНІЖНЫ АГЛЯД ........ 65

## ГІСТОРЫЯ

Аляксей КАПЛІЕЎ.
Медыцынскі перыядычны друк на тэрыторыі Беларусі ў канцы XVIII – першай трэці XX стагоддзя ........ 66

Аляксандр ГОРНЫ.
Перыядызацыя гісторыі беларускага нацыянальнага руху ў Заходняй Беларусі (1921–1939) ........ 75

Сергей ГВАРДИЯН.
Преобразование военных территорий Российской империи накануне Первой мировой войны на примере Виленского военного округа ........ 83

## ФІЛАЛОГІЯ

Ірына ЛАПЦЁНАК.
Прафесійны вопыт у галіне аховы гісторыка-культурнай спадчыны ў фармаце міжкультурнага ўзаемадзеяння ........ 90

## САЦЫЯЛОГІЯ

Елена СИМАКОВА.
Споры семейные – интерес государственный ........ 97

## КРЫТЫКА І БІБЛІЯГРАФІЯ

Александр ДАНИЛОВ.
ЖИЗНЬ В СЕТЕВОМ ОБЩЕСТВЕ… ........ 103


**«БЕЛАРУСКАЯ ДУМКА» –**
пераможца V Нацыянальнага конкурсу друкаваных СМІ «Залатая літара» ў намінацыі «Лепшы навуковы, навукова-папулярны часопіс», IX Нацыянальнага конкурсу друкаваных СМІ «Залатая літара» і XVI Нацыянальнага конкурсу «Залатая літара» ў намінацыі «Лепшыя матэрыялы навуковай, навукова-папулярнай тэматыкі»



### АБ ВЫДАННІ


Часопіс выходзіць на беларускай, рускай і англійскай мовах.
Аўтары апублікаваных матэрыялаў у адпаведнасці з Законам Рэспублікі Беларусь «Аб сродках масавай інфармацыі» нясуць адказнасць за дакладнасць прыведзеных фактаў і звестак.
Рэдакцыя можа друкаваць артыкулы ў парадку абмеркавання, не падзяляючы пункту гледжання аўтара.


Перадрукоўванне дазваляецца па ўзгадненні з рэдакцыяй, спасылка на часопіс «Беларуская думка» абавязковая.


### НЯШТАТНЫМ АЎТАРАМ


У адпаведнасці з загадам Вышэйшай атэстацыйнай камісіі ад 09.06.2016 года № 158 і рашэннем Калегіі Вышэйшай атэстацыйнай камісіі Рэспублікі Беларусь ад 12.06.2009 года № 11/6 часопіс уключаны ў Пералік навуковых выданняў Рэспублікі Беларусь для апублікавання вынікаў дысертацыйных даследаванняў па гістарычных, палітычных, філалагічных, філасофскіх, эканамічных і сацыялагічных навуках.

# Перыядызацыя гісторыі беларускага нацыянальнага руху ў Заходняй Беларусі (1921–1939)

УДК 930(476)(1921–1939)



**Аляксандр ГОРНЫ,**
**кандыдат гістарычных навук, дацэнт**

**Аляксандр ГОРНЫ. Перыядызацыя гісторыі беларускага нацыянальнага руху ў Заходняй Беларусі (1921–1939).** У артыкуле на аснове аналізу беларускай і замежнай гістарыяграфіі разглядаецца праблема перыядызацыі беларускага нацыянальна-вызваленчага руху ў міжваеннай Польшчы. Робіцца выснова аб адсутнасці ў сучаснай гістарыяграфіі актуальнай перыядызацыі гэтага аспекта. Аўтарам артыкула распрацаваны ўласны падзел на перыяды, які складаецца з фазы развіцця беларускага нацыянальнага руху ў Заходняй Беларусі, фазы крызісу і фазы арганізацыйнага заняпаду. Асноўны крытэрый пры распрацоўцы тэмы – унутранае развіццё самога руху як асобнай сістэмы грамадскага жыцця, што складалася з розных палітычных плыняў.
**Ключавыя словы:** перыядызацыя, Заходняя Беларусь, міжваенны перыяд, беларускі нацыянальны рух, нацыянальнае пытанне, міжваенная Польшча.

**Aliaksandr GORNY. Periodization of the history of the Belarusian national movement in Western Belarus (1921-1939).** The article analyzes Belarusian and foreign historiography in order to take a look at the problem of periodization of the Belarusian national liberation movement in Poland between wars. The author concludes that modern historiography lacks periodization of this aspect. The author came up with his own periodization, which includes the phase of development of the Belarusian national movement in Western Belarus, the phase of the crisis, and the phase of organizational decline. The main criterion in exploring the topic is the internal development of the movement itself as an independent system of public life made up of different political currents.
**Keywords:** periodization, Western Belarus, interwar period, Belarusian national movement, ethnic problem, Poland between wars.

Перыядызацыя – адна з важных тэарэтычных уласцівасцей гісторыі як навуковай дысцыпліны. Мы разглядаем мінулае праз прызму розных перыядаў, якія, з'яўляючыся інтэлектуальнымі канструктамі гісторыкаў, аказваюць значны ўплыў на наша ўспрыманне гістарычнага працэсу і гістарычную памяць. Навукова распрацаваная перыядызацыя вызначае змест вучэбных праграм, напрамкі навуковых даследаванняў, устанаўлівае рамкі тэарэтычнага дыскурсу па той ці іншай праблеме. Амерыканскі гісторык У. Грын назваў межы перыядаў «інтэлектуальнымі ўціхамірвальнымі кашулямі», што глыбока ўплываюць на нашы вобразы, гістарычныя асацыяцыі, і той сродак, дзякуючы якому мы ўспрымаем пачатак, сярэдзіну і канец розных рэчаў *[1, p. 13]*.

У беларускай гістарыяграфіі на сёння праблема перыядызацыі гістарычных падзей з'яўляецца актуальнай і злабадзённай з метадалагічнага пункту гледжання. Сучасныя беларускія гісторыкі і выкладчыкі ў сваёй практыцы нярэдка карыстаюцца вылучанымі іх папярэднікамі ў межах яшчэ дарэвалюцыйнай або савецкай гістарыяграфіі перыядамі, на якія наклаўся адбітак пэўных эпох, ідэалагічных сістэм і ўстарэлых навуковых падыходаў *[2, с. 5]*. На сучасным этапе многія аспекты айчыннай

**ПРА АЎТАРА**

ГОРНЫ Аляксандр Сяргеевіч.

Нарадзіўся ў 1988 годзе ў г. Гродне. Скончыў факультэт гісторыі і сацыялогіі Гродзенскага дзяржаўнага ўніверсітэта імя Янкі Купалы (2011). З 2018 года – дактарант Інстытута гісторыі НАН Беларусі.

З 2015 года – выкладчык-стажор, старшы выкладчык, з 2018 года – дацэнт кафедры гісторыі Беларусі, археалогіі і спецыяльных гістарычных дысцыплін Гродзенскага дзяржаўнага ўніверсітэта імя Янкі Купалы.

Кандыдат гістарычных навук (2016), дацэнт (2020).

Аўтар 70 навуковых публікацый, у тым ліку дзвюх калектыўных манаграфій, аднаго даведачнага выдання.

Сфера навуковых інтарэсаў: гісторыя беларускага нацыянальнага руху ў ХХ стагоддзі, палітычная і канфесійная гісторыя Заходняй Беларусі ў міжваенны перыяд, гісторыя беларускай дыяспары, гісторыя паўсядзённасці.

pawet.net

гісторыі ў факталагічным плане адлюстраваны дастаткова падрабязна, аднак іх канцэптуальнае асвятленне выклікае пэўныя цяжкасці. Сярод праблем, якія паранейшаму не маюць актуальна распрацаванай перыядызацыі, можна назваць гісторыю беларускага нацыянальнага руху ў Заходняй Беларусі.

У другой палове 1950-х гадоў у беларускай савецкай гістарыяграфіі адбываюцца кардынальныя змяненні ў адносінах да гісторыі нацыянальна-вызваленчага руху ў Заходняй Беларусі. Падчас XX з'езда КПСС была рэабілітавана дзейнасць КПЗБ у міжваенны перыяд, што прадвызначыла бум даследаванняў заходнебеларускай палітычнай гісторыі. Пачалі з'яўляцца шматлікія манаграфіі па гісторыі леварадыкальных і пракамуністычных арганізацый у Заходняй Беларусі, сярод якіх трэба адзначыць абагульняючую працу У. і І. Палуянаў, выдадзеную ў 1962 годзе. У гэтай кнізе бадай упершыню была зроблена спроба вызначыць навуковую перыядызацыю т. зв. «рэвалюцыйнага» і нацыянальна-вызваленчага руху ў Заходняй Беларусі, з выкарыстаннем, безумоўна, марксісцкай навуковай метадалогіі. Аўтары вылучылі чатыры перыяды, якія адрозніваліся асаблівасцю эканамічнага становішча і сацыяльна-палітычных умоў у міжваеннай Польшчы. Так, першы перыяд (1921–1924) вызначаўся «пачаткам стабілізацыі капіталізму» і разгортваннем прасавецкага партызанскага руху. Для другога перыяду (1925–1929) была характэрна «адносная стабілізацыя капіталізму», якая прадвызначыла суадносіны легальных і нелегальных форм рэвалюцыйнай барацьбы (дзейнасць БСРГ, ТБШ і інш.). Трэці перыяд (1929–1933) быў звязаны з сусветным эканамічным крызісам і, адпаведна, «новым уздымам рэвалюцыйнай барацьбы рабочага класа і сялянства». Чацвёрты (1934–1939) характарызаваўся «гаспадарчай дэпрэсіяй», уздымам фашызму і стварэннем антыфашысцкага народнага фронту *[3, с. 7–8]*. Як бачна, галоўным фактарам канструявання перыядаў з'яўлялася эканамічная сітуацыя ў міжваеннай Польшчы і яе наступствы для палітычнай «надбудовы». Гэта перыядызацыя будавалася з улікам дзейнасці выключна левaрадыкальных і прасавецкіх сіл у Заходняй Беларусі, беларускія нацыянальна-дэмакратычныя і паланафільскія арганізацыі (напрыклад БХД, Часовая беларуская рада і інш.) у ёй ігнараваліся. Таксама не ўлічваліся іншыя фактары: палітыка польскіх улад адносна розных беларускіх структур, выбарчыя кампаніі ў польскі парламент, ступень масавасці беларускага руху ў розныя гады і яго распаўсюджанне па рэгіёнах Заходняй Беларусі. Тым не менш фактычна адразу перыядызацыя У. і І. Палуянаў пачала выкарыстоўвацца ў тагачасным навуковым дыскурсе, доказ чаго – зборнік дакументаў «Борьба трудящихся Западной Белоруссии за социальное и национальное освобождение и воссоединение с БССР» *[4, с. 2]*.

У канцы 1980-х – пачатку 1990-х гадоў, калі ў беларускай гістарыяграфіі пачаўся новы этап, звязаны з больш крытычным вывучэннем мінулага, гісторыкамі былі пераасэнсаваны многія старонкі барацьбы беларусаў за нацыянальнае самавызначэнне ў міжваеннай Польшчы. З'явіліся новыя даследаванні па гісторыі розных беларускіх палітычных і культурна-асветных арганізацый і груп у Заходняй Беларусі, якім у савецкай гістарыяграфіі па ідэалагічных меркаваннях адводзілася другасная роля. Аднак, нягледзячы на ба-

▼ **Бланк членскага білета БХД. 1920-я гады**
Цэнтральны дзяржаўны архіў Літвы. Друкуецца ўпершыню.


BIELARUSKAJA
CHRYŠCIJANSKAJA DEMOKRACYJA
(B. Ch. D.)

№

SIABROŬSKI BILET.

(imia i proźwišča)
jaki pražywaje ..................

.................. gminy .................. pawietu,

zjaŭlajecca siabram B. Ch. D.

Staršynia

Sekretar

Dnia .................. 192 — h.
Wilnia, Polackaja 4-10.

Centralny Kamitet B. Ch. D.

гатую фakталагічную базу і аналітыку гістарыяграфічнага ўкладу па той ці іншай праблеме, для гэтых прац быў характэрны даволі нізкі ўзровень тэарэтычнага дыскурсу.

Адсутнасць больш-менш выразных тэарэтычных і абагульняючых даследаванняў прывяла да таго, што новая перыядызацыя беларускага нацыянальнага руху ў Заходняй Беларусі так і не знайшла сваёй канцэптуальнай распрацоўкі з улікам апошніх дасягненняў айчыннай гістарыяграфіі. Каб запоўніць гэтую нішу, некаторыя гісторыкі вярталіся да перыядызацыі Палуянаў і спрабавалі адаптаваць яе да новых умоў *[5, с. 29]*. Напрыклад, у шасцітомнай «Гісторыі Беларусі», выдадзенай Інстытутам гісторыі НАН Беларусі ў 2007 годзе, у раздзеле аб змаганні беларусаў за нацыянальнае і сацыяльнае вызваленне ў міжваеннай Польшчы гэта перыядызацыя прынята за асноўную, але яе сэнсавае напаўненне змянілася. У прыватнасці, у першым перыядзе (1921–1924) разглядаўся не толькі партызанскі рух, але і легальныя формы барацьбы беларусаў за свае правы, утварэнне шэрага беларускіх палітычных і культурна-асветных арганізацый і інш. *[6, с. 379–422]*. Аднак выкарыстанне перыядызацыі Палуянаў у сучасных умовах з навуковага пункту гледжання выглядае немэтазгодным і нават дзіўным: перыяды, сфарміраваныя па эканамічных крытэрыях, не суадносяцца з унутранымі працэсамі развіцця беларускага нацыянальнага руху ў Заходняй Беларусі і таму выглядаюць асінхроннымі. Эканоміка была толькі адным са шматлікіх фактараў, якія ўплывалі на развіццё беларускага руху, але не самым асноўным.

Спроба па-іншаму асэнсаваць перыядызацыю дзейнасці беларускіх арганізацый у міжваеннай Польшчы была зроблена ўкраінскім даследчыкам Г. Дзядурыным. Ён вызначыў два перыяды: 1921–1926 гады – станаўленне асноўных напрамкаў беларускага руху; 1926–1939 гады – узмацненне ўнутраных супярэчнасцей паміж рознымі напрамкамі беларускага руху ва ўмовах палітыкі дзяржаўнай асіміляцыі ў Польшчы *[7, с. 11–13]*. Мяжой іх аўтар вызначыў 1926 год – майскі пераварот у Польшчы і прыход да ўлады Ю. Пілсудскага, што значна змяніла нацыянальную палітыку польскіх улад адносна беларусаў. Разам з тым палітыка рэжыму «санацыі» па беларускім пытанні была рознабаковай і ўключала некалькі этапаў, не адлюстраваных у перыядызацыі Дзядурына.

На сучасным этапе развіцця гістарыяграфіі былі распрацаваны перыядызацыі асобных аспектаў гісторыі беларускага нацыянальнага руху ў міжваеннай Заходняй Беларусі. Так, польскі даследчык Е. Трачук прапанаваў падзяліць гісторыю беларускамоўнага перыядычнага друку ў Заходняй Беларусі на два перыяды: 1918–1930 і 1930–1939 гады. Менавіта ў 1930 годзе пасля ліквідацыі пасольскага клуба «Змаганне» беларускі друк, на думку гісторыка, страціў легальную падтрымку і вымушаны быў шукаць сродкі для свайго развіцця *[8, s. 35, 95]*.

Беларускі гісторык А. Радзюк вылучыў чатыры перыяды дзейнасці беларускіх кааператываў у Заходняй Беларусі: 1920–1926 гады – вядучае становішча Віленскага саюза кааператываў і Беларускага кааператыўнага банка ў кааператыўным руху; 1926–1929 гады – уплыў на развіццё беларускага кааператыўнага руху з боку БСРГ, ТБШ і пасольскага клуба «Змаганне»; 1929–1933 гады – беларускі кааператыўны рух у час сусветнага эканамічнага крызісу; 1934–1939 гады – развіццё беларускага кааператыўнага руху ва ўмовах заканадаўчых змен і паступовага ўключэння беларускіх кааператываў у польскую эканамічную прастору *[9, с. 13–14]*. З апошніх даследаванняў неабходна ўзгадаць перыядызацыю дзейнасці камуністычных структур у Палескім ваяводстве, прапанаваную польскім гісторыкам П. Ціхарацкім. У адрозненне ад марксісцкага падыходу і перыядызацыі Палуянаў, Ціхарацкі звярнуў увагу перш за ўсё на арганізацыйны стан структур КПЗБ і КСМЗБ у Палескім ваяводстве і на гэтай падставе вызначыў тры перыяды: 1921–1929, 1930–1934, 1935–1938 гады *[10, s. 12]*.

Істотнай праблемай у вызначэнні перыядызацыі беларускага нацыянальнага руху ў Заходняй Беларусі з'яўляецца пэўны «дуалізм», які існуе адносна гэтага руху ў гістарыяграфіі. Як савецкія, так і сучасныя беларускія гісторыкі спрабуюць адмежаваць беларускі левадыкальны і пракамуністычны рух ад некамуністычных структур (нацыянальна-дэмакратычных і паланафільскіх арганізацый) і падкрэсліць яго асаблівы, а ў нейкай ступені і першасны характар *[5, с. 28]*. Гэта акалічнасць – спадчына савецкай гістарыяграфічнай традыцыі, якая не дазваляе разглядаць беларускі нацыянальны рух у міжваеннай Польшчы як цэласную сістэму, што складалася з розных кампанентаў, плыняў і напрамкаў. Таму пры вызначэнні навуковай перыядызацыі беларускага нацыянальнага руху ў Заходняй Беларусі трэба ўлічваць увесь спектр палітычных і грамадскіх сіл, якія змагаліся за нацыянальнае самавызначэнне заходнебеларускіх зямель і аб'яднанне іх з астатнімі беларускімі тэрыторыямі.

Яшчэ адным важным пытаннем у распрацоўцы перыядызацыі з'яўляецца яе сінхранізацыя з тымі працэсамі, якія адбываліся ў Савецкай Беларусі і асяроддзі беларускай эміграцыі ў міжваенны перыяд. Грамадска-палітычнае жыццё ў БССР і замежных беларускіх асяродках у 1920–1930-я гады шмат у чым уплывала на расстаноўку палітычных сіл у рамках беларускага руху ў Заходняй Беларусі як у арганізацыйным, так, напрыклад, і ў фінансавым аспекце. Кантакты замежнай групы беларускіх эсэраў з метраполіяй, палітыка беларусізацыі і два ўзбуйненні тэрыторыі БССР, пачатак сталінскіх рэпрэсій і барацьба з «нацыянал-дэмакратызмам» – усе гэтыя і іншыя падзеі мелі значнае адлюстраванне і ў заходнебеларускім палітычным дыскурсе, таму іх немагчыма ігнараваць пры распрацоўцы перыядаў па адзначанай вышэй праблеме.

Аўтар артыкула распрацаваў уласную перыядызацыю, заснаваную на наступных крытэрыях: 1) унутранае арганізацыйнае развіццё беларускага нацыянальнага руху ў Заходняй Беларусі як агульнай сістэмы, якая складалася з левадыкальнага, нацыянальна-дэмакратычнага і паланафільскага напрамкаў; 2) суіснаванне ў рамках беларускага руху легальных і нелегальных форм барацьбы; 3) палітыка польскіх улад у дачыненні да арганізацыйнай дзейнасці структур беларускага руху ў Заходняй Беларусі; 4) актыўнасць ці пасіўнасць лідараў і шараговых актывістаў беларускага руху, уласнае ўяўленне дзеячаў аб арганізацыйных магчымасцях гэтага руху і перспектывах далейшай барацьбы.

Абапіраючыся на названыя крытэрыі, а таксама на значны фактаграфічны матэрыял, назапашаны ў ходзе аналізу гістарыяграфіі па гісторыі Заходняй Беларусі і архіўных крыніц, можна вылучыць тры перыяды дзейнасці беларускага нацыянальна-вызваленчага руху ў міжваеннай Польшчы, якія мы назавём фазамі.

**1921–1927 гады – фаза развіцця.** Гэты перыяд пачынаецца з даты заключэння Рыжскага мірнага дагавора і юрыдычнага ўваходжання заходнебеларускіх зямель у склад Польшчы, характарызуецца павелічэннем актыўнасці беларускага нацыянальнага руху, пашырэннем яго публічнай прасторы і арганізацыйным афармленнем трох асноўных плыняў: левадыкальнай, нацыянальна-дэмакратычнай і паланафільскай. Менавіта ў гэты час у Заходняй Беларусі сфарміраваліся найбольш вядомыя актары на заходнебеларускай палітычнай і культурна-асветнай арэне, вакол якіх аб'ядноўваліся актывісты беларускага руху розных плыняў (Беларуская сялянска-работніцкая грамада, Беларуская хрысціянская дэмакратыя, Камуністычная партыя Заходняй Беларусі, Беларускі сялянскі саюз, Таварыства беларускай школы, Беларускі інстытут гаспадаркі і культуры, таварыства «Прасвета», Часовая беларуская рада) *[11]*. Асаблівасцю гэтага перыяду можна лічыць пачатак суіснавання легальных і нелегальных форм барацьбы беларусаў за свае нацыянальныя правы, звязаных, з аднаго боку, з разгортваннем праэсэраўскага і прасавецкага партызан-




**Сябры будслаўскага гуртка Беларускага інстытута гаспадаркі і культуры. 1920-я гады**
Цэнтральны дзяржаўны архіў Літвы. Друкуецца ўпершыню.

скага руху, фарміраваннем нелегальных структур Беларускай рэвалюцыйнай арганізацыі і КПЗБ, а з другога – утварэннем парламенцкіх фракцый Беларускага пасольскага клуба і клуба Беларускай сялянска-работніцкай грамады *[12, с. 591–594]*.

Характэрнай рысай фазы развіцця беларускага руху ў Заходняй Беларусі ў 1921–1927 гады была рэалізацыя некалькіх «праектаў», якія засведчылі масавасць руху, яго арганізаванасць і значнае тэрытарыяльнае пашырэнне. Першым з іх можна лічыць перадвыбарную кампанію ў польскі парламент 1922 года, якую беларусы праводзілі ў межах Блока нацыянальных меншасцей. У агітацыі прымалі ўдзел практычна ўсе спачуваючыя на той час беларускаму нацыянальнаму руху прадстаўнікі грамадства: ад настаўнікаў і вучняў да праваслаўных святароў. Нават прадстаўнікі польскай улады прызналі агітацыйную кампанію беларусаў вельмі актыўнай *[13, с. 161]*. У 1925–1926 гадах беларускія актывісты пачалі рэалізацыю другога «праекта» – масавай кампаніі па зборы дэкларацый на адкрыццё беларускіх школ у Заходняй Беларусі, каардынатарам якога выступала Цэнтральная беларуская школьная рада. Трэцім «праектам», што ўзняў беларускі рух у міжваенай Польшчы на яшчэ больш значны ўзровень, можна лічыць масавую арганізацыю ў заходнебеларускай правінцыі гурткоў Беларускай сялянска-работніцкай грамады ў другой палове 1926 года.

У 1927 годзе ў грамадска-палітычным жыцці Заходняй Беларусі назіраліся некалькі важных падзей, якія прадвызначылі завяршэнне фазы развіцця беларускага нацыянальна-вызваленчага руху. Па-першае, 14–15 студзеня 1927 года польскія ўлады пачалі працэс ліквідацыі БСРГ і арыштавалі лідараў гэтай арганізацыі. Гэта падзея негатыўна паўплывала на арганізацыйнае ўнутранае становішча беларускага нацыянальна-вызваленчага руху ў Заходняй Беларусі, прадвызначыўшы яго крызіс. Многія беларусы розных палітычных плыняў (акрамя паланафілаў) расцанілі рэпрэсіі польскіх улад адносна Грамады як накіраваныя на беларускі рух у цэлым

*[14, s. 51]*. Па-другое, у ліпені 1927 года адбыўся раскол у Віленскім беларускім нацыянальным камітэце – цэнтральнай каардынацыйнай установе беларускага руху ў Заходняй Беларусі. Падчас расколу ўтварыліся два «камітэты», якія прэтэндавалі на лідзіруючыя пазіцыі: адзін аб'ядноўваў прадстаўнікоў левара-дыкальнай плыні, а другі – членаў БХД і Беларускага сялянскага саюза *[11, s. 542]*. Гэтая падзея засведчыла няздольнасць беларускіх эліт пасля разгрому БСРГ знайсці палітычны кансэнсус і адэкватна, агульнымі намаганнямі, рэагаваць на пераследаванне з боку польскіх улад. Па-трэцяе, у 1927 годзе адбылося пашырэнне беларускага паланафільскага руху праз стварэнне групы Ф. Умястоўскага і Беларускай радыкальна-народнай партыі, што паказвала на жаданне польскіх улад знайсці новыя рычагі ўздзеяння на беларускае палітычнае жыццё ў постграмадаўскіх умовах *[11, s. 519]*. Гэтыя акалічнасці завяршылі фазу развіцця беларускага руху ў Заходняй Беларусі і прадвызначылі фарміраванне новага перыяду.

**1928–1935 гады – фаза крызісу.** У 1928 годзе ў беларускім нацыянальна-вызваленчым руху ў міжваеннай Польшчы пачынаюць праяўляцца крызісныя тэндэнцыі. Яны былі звязаны як з палітыкай польскіх улад адносна беларускай меншасці, так і ўнутранымі супярэчнасцямі ў беларускім руху. У прыватнасці, пасля ліквідацыі БСРГ польскія ўрадавыя колы звярнулі ўвагу на значную радыкалізацыю беларускага грамадска-палітычнага жыцця і таму зрабілі некалькі контрзахадаў, каб знізіць антыпольскія тэндэнцыі ў беларускім грамадстве. Напрыклад, у верасні 1928 года была закрыта Радашковіцкая беларуская гімназія з-за левара-дыкальных настрояў сярод вучняў, а ў іншых беларускіх сярэдніх навучальных установах пачалі праводзіцца «чысткі», падчас якіх з гімназій выгналі вучняў, падазраваных у камуністычнай дзейнасці *[15, s. 539]*. У снежні 1928 года ксяндзам было забаронена прымаць удзел у дзейнасці Беларускай хрысціянскай дэмакратыі і публікавацца на старонках газеты «Беларуская крыніца» *[16, с. 541]*. У польскім палітычным дыскурсе пачала пашырацца ідэя «дзяржаўнай асіміляцыі» беларусаў, паводле якой беларуская меншасць павінна была стаць інтэграванай часткай польскага грамадства і добрасумленнымі грамадзянамі Польшчы.

З 1928 года ў беларускім нацыянальным руху ў Заходняй Беларусі пачаў дамінаваць цэнтрабежны вектар. Асаблівасцю фазы крызісу можна лічыць шэраг расколаў у палітычных і культурна-асветных арганізацыях, а таксама вострую канкурэнцыю паміж рознымі плынямі беларускага руху. Напрыклад, у парламенцкіх выбарах 1928 года ў Польшчы ўдзельнічала пяць выбарчых беларускіх спісаў, якія канкурыравалі паміж сабой *[17, с. 72–73]*. У 1929 годзе адбыўся раскол у ТБШ, калі з арганізацыі былі выключаны дзеячы, што выступалі супраць палітызацыі дзейнасці таварыства *[6, с. 404]*. У гэты перыяд на заходнебеларускай палітычнай сцэне ўзнікла новая палітычная сіла – так званая беларуская санацыя, або група Луцкевіча-Астроўскага. Яна імкнулася заняць нішу канструктыўнай апазіцыі да польскіх улад. Прадстаўнікі беларускай санацыі, многія з якіх у мінулым былі актывістамі БСРГ (А. Луцкевіч, Р. Астроўскі, Я. Шнаркевіч, К. Крук і інш.), заклікалі беларусаў адмовіцца ад радыкальнай палітычнай дзейнасці, прызнаць польскую дзяржаўнасць, звярнуць увагу на культурна-асветную працу і на захаванне беларускіх грамадскіх і культурных інстытутаў. Дзякуючы фінансавай дапамозе польскіх улад, беларуская санацыя мела магчымасць легальна падтрымліваць жыццядзейнасць некаторых беларускіх устаноў (Беларускі музей імя І. Луцкевіча, Віленская беларуская гімназія і інш.), выдавала ўласныя беларускамоўныя перыядычныя выданні. Аднак «памяркоўная» пазіцыя гэтага палітычнага напрамку вельмі востра крытыкавалася з боку беларускіх хрысціянскіх дэмакратаў і камуністаў *[12, с. 585]*.

Пэўныя ўнутрыпартыйныя рознагалоссі ў названы перыяд закранаюць

і беларускі левaрадыкальны рух. На першым з'ездзе КПЗБ у 1928 годзе ўтвараюцца дзве групы, якія прапаноўвалі розныя стратэгіі развіцця партыі *[3, с. 137]*. На дзейнасць беларускіх левых у Заходняй Беларусі значны ўплыў аказвалі працэсы ў БССР, дзе ў канцы 1920-х гадоў пачалася барацьба з так званым «нацыянал-дэмакратызмам» і «нацыянал-апартунізмам». Выезд у Савецкую Беларусь многіх левaрадыкальных лідараў і актывістаў, дзе тыя сталі ахвярамі сталінскіх рэпрэсій, быў адной з падстаў крызісных з'яў у арганізацыйным і ідэалагічным жыцці гэтай плыні беларускага руху.

У 1928–1935 гадах публічная прастора беларускага нацыянальнага руху ў Заходняй Беларусі фактычна пераўтварылася ў месца, дзе лідары зводзілі асабістыя рахункі паміж сабой. Крызісныя з'явы былі настолькі моцнымі, што нават пранікалі на старонкі дзіцячых часопісаў, якія сталі месцам унутрыпалітычных спрэчак розных беларускіх груповак *[18, с. 185]*. Арганізацыйны і інтэлектуальны крызіс руху прывёў да страты ім прывабнасці сярод многіх дзеячаў. Менавіта ў гэты перыяд актывісты розных арганізацый адыходзяць ад грамадскай дзейнасці, пачынаючы працэс адаптацыі да польскага грамадства і вырашэння паўсядзённых жыццёвых праблем (напрыклад, В. Рагуля, Ю. Сабалеўскі і інш.). Акрамя таго, адсутнасць у 1935 годзе ў польскім парламенце прадстаўнікоў беларускага нацыянальнага руху, а таксама раскол у беларускай санацыі паміж А. Луцкевічам і Р. Астроўскім прадвызначылі значнае звужэнне легальных сродкаў існавання беларускіх грамадскіх і культурных ініцыятыў і пераход фазы крызісу ў фазу арганізацыйнага заняпаду.

**1936–1939 гады – фаза арганізацыйнага заняпаду.** У 1936 годзе ў заходнебеларускім часопісе «Маладая Беларусь» выйшаў артыкул В. Грышкевіча «Ці існуе крызіс беларускага руху?». У ім падкрэслівалася, што ў беларускім нацыянальным руху ў Заходняй Беларусі настаў вельмі моцны арганізацыйны крызіс, аднак у цэлым беларускі рух, паводле аўтара, не знаходзіўся ў стадыі смерці і карыстаўся значным уплывам сярод насельніцтва, аб чым сведчыць пашырэнне нацыянальнай самасвядомасці беларусаў у Польшчы *[19, с. 67]*. З гэтым сцвярджэннем Грышкевіча нельга не пагадзіцца, таму з 1936 года ў беларускім руху ў Заходняй Беларусі пачалася фаза арганізацыйнага заняпаду. Яна была выклікана трыма прычынамі: папярэднім арганізацыйным крызісам руху, палітыкай польскіх улад у адносінах да беларускай меншасці і адсутнасцю знешняй падтрымкі з боку БССР і эміграцыйнага асяроддзя.

З другой паловы 1930-х гадоў польскія ўлады вярнуліся да ранейшай канцэпцыі нацыянальнай асіміляцыі беларусаў і ажыццявілі шэраг практычных захадаў у гэтым напрамку з мэтай звузіць да мінімуму нацыянальную актыўнасць беларусаў. Так, у 1936–1938 гадах былі забаронены і ліквідаваны Таварыства беларускай школы, Беларускі інстытут гаспадаркі і культуры, Таварыства беларускай асветы, Беларускі настаўніцкі саюз, Беларускі нацыянальны камітэт у Вільні *[6, с. 422]*. У 1937 годзе пастановай Віленскага акруговага суда было


50 50 50 50

БЕЛАРУСКІ НАЦЫЯНАЛЬНЫ КАМІТЭТ
м. ВІЛЬНІ.

ПАДАТКОВЫ КВІТ №

Грам.

заплаціў пяцьдзесят польск. марак
аднаразовага самахвотнага нацыянальнага падатку.

Старшыня К-ту

Сябра Фін. Камісіі

Скарбнік К-ту

50 50
1920 год

▼ **Квітанцыя аб аплаце добраахвотнага нацыянальнага падатку ў Беларускі нацыянальны камітэт у Вільні. 1920 год**
Цэнтральны дзяржаўны архіў Літвы. Друкуецца ўпершыню.

забаронена выданне адной з найбольш уплывовых і папулярных газет беларусаў у міжваеннай Польшчы – «Беларускай крыніцы» *[8, s. 125]*. Некаторых лідараў беларускага руху (Р. Астроўскі, А. Станкевіч, А. Клімовіч і інш.) па распараджэнні ўлад выслалі з Вільні ва ўнутраныя раёны Польшчы.

У 1938 годзе рашэннем Камінтэрна была распушчана КПЗБ, што стала прычынай арганізацыйнага заняпаду беларускага леварадыкальнага руху ў Заходняй Беларусі і адсутнасці перспектыў па яго аднаўленні. Беларусы былі пазбаўлены дапамогі і з боку эміграцкіх беларускіх цэнтраў, якія таксама знаходзіліся ў глыбокім крызісе змены пакаленняў і геапалітычных арыенціраў. Дадзеныя акалічнасці прадвызначылі спыненне знешняй фінансавай дапамогі, важнай для падтрымкі жыццядзейнасці многіх беларускіх ініцыятыў.

Па стану на 1939 год у Заходняй Беларусі дзейнічала ўсяго пяць беларускіх палітычных і грамадска-культурных арганізацый і структур: Беларускае народнае аб'яднанне (былая БХД), Беларускі студэнцкі саюз, Таварыства прыяцеляў беларусаведы пры Віленскім універсітэце, група «Беларускі фронт» В. Гадлеўскага, Беларускае навуковае таварыства. Практычна ўсе гэтыя арганізацыі пераўтварыліся ў віленскія клубы «па інтарэсах», якія былі малалікімі і не мелі сваёй разгалінаванай структуры ў правінцыі. Тым не менш, нягледзячы на арганізацыйны заняпад, беларускі рух працягваў існаваць у заходнебеларускай прасторы ў выглядзе распаўсюджвання кніг, перыядычных выданняў, арганізацыі асветных мерапрыемстваў. Да беларускай дзейнасці далучалася маладое пакаленне актывістаў са значным інтэлектуальным багажом, якое магло стаць падмуркам для новага ўздыму арганізацыйнага жыцця беларускага руху ў міжваеннай Польшчы.

Такім чынам, праблема перыядызацыі гісторыі беларускага нацыянальнага руху ў Заходняй Беларусі на сённяшні час патрабуе комплекснага асэнсавання з улікам новых дасягненняў айчыннай і замежнай гістарыяграфіі. Прапанаваная вышэй перыядызацыя, якая падзяляе гісторыю беларускага руху ў Заходняй Беларусі на тры фазы, распрацавана з улікам найбольш істотных крытэрыяў, і ў першую чаргу ўнутранага развіцця самога руху як асобнай сістэмы грамадскага жыцця. Аднак гэта перыядызацыя з'яўляецца інтэлектуальным канструктам, які, безумоўна, патрабуе навуковага абмеркавання і магчымага ўдакладнення. Актыўны ўдзел навуковай супольнасці Беларусі і замежжа ў гэтым працэсе можа стаць пачаткам плённай дыскусіі аб перыядызацыі навейшай гісторыі Беларусі ў цэлым.

*Артыкул паступіў у рэдакцыю 09.04.2020 г.*

## СПІС ВЫКАРЫСТАНЫХ КРЫНІЦ


1. Green, William A., Periodization in European and World History / William A. Green // Journal of World History. – 1992. – Vol. 3, № 1. – P. 13–53.
2. Галубовіч, В. Перыядызацыя як праблема гістарыяграфіі гісторыі Беларусі / В. Галубовіч // Гістарычны альманах. – 2002. – Т. 7. – С. 5–10.
3. Полуян, В.А. Революционное и национально-освободительное движение в Западной Белоруссии в 1920–1939 гг. / В.А. Полуян, И.В. Полуян. – Минск: Госиздат БССР, 1962. – 224 с.
4. Борьба трудящихся Западной Белоруссии за социальное и национальное освобождение и воссоединение с БССР: документы и материалы: в 2 т. – Минск: Госиздат БССР, 1962–1972. – Т. 1: 1921–1929 гг. – 1962. – 620 с.
5. Вабішчэвіч, А. З гістарыяграфіі гісторыі Заходняй Беларусі 1920–30-х гадоў: пытанні перыядызацыі нацыянальна-вызвольнага руху / А. Вабішчэвіч // Гістарычны альманах. – 2002. – Т. 7. – С. 27–30.
6. Гісторыя Беларусі: у 6 т. / рэдкал.: М. Касцюк (гал. рэд.) [і інш.]. – Т. 5: Беларусь у 1917–1945 гг. / А. Вабішчэвіч [і інш.]. – Мінск: Экаперспектыва, 2006. – 613 с.
7. Дедурін, Г.Г. Діяльність білоруських національних організацій у Польщі (1921–1939 рр.): автореф. дис. … канд. іст. наук: 07.00.02 / Г.Г. Дедурін. – Харків, 2006. – 24 с.
8. Traczuk, J. Czasopiśmiennictwo białoruskie w II Rzeczypospolitej (1918–1939) / J. Traczuk. – Siedlce: Wyd-wo Uniwersytetu Przyrodniczo-Humanistycznego w Siedlcach, 2013. – 270 s.
9. Радзюк, А.Л. Беларускія кааператывы ў Заходняй Беларусі (1921–1939 гг.): аўтарэф. дыс. … канд. гіст. навук: 07.00.02 / А.Л. Радзюк. – Мінск, 2014. – 20 с.
10. Cichoracki, P. Komuniści na Polesiu w latach 1921–1939 / P. Cichoracki. – Łomianki: Wydawnictwo LTW, 2016. – 274 s.
11. Trejdeński, P. Białoruskie stronnictwa polityczne w Polsce i ich ideologja / P. Trejdeński // Sprawy Narodowościowe. – 1930. – Nr 5–6. – S. 513–543.
12. История белорусской государственности: в 5 т. – Т. 3: Белорусская государственность: от идеи к национальному государству (1917–1939 гг.) / А.А. Коваленя [и др.]; Нац. акад. наук Беларуси, Ин-т истории. – Минск: Беларуская навука, 2019. – 639 с.
13. Кароткі нарыс беларускага пытаньня. – Мінск: Логвінаў, 2009. – 396 с.
14. Białorusini // Sprawy Narodowościowe. – 1927. – № 1. – S. 51–52.
15. Białorusini // Sprawy Narodowościowe. – 1928. – № 5. – S. 537–540.
16. Станкевіч, А. З Богам да Беларусі: збор твораў / А. Станкевіч. – Вільня: Інстытут беларусістыкі, 2008. – 1097 с.
17. Пашкевіч, А.В. Парламенцкія формы змагання за нацыянальныя і сацыяльныя правы беларускага народа ў міжваеннай Польшчы (1921–1930 гг.): дыс. … канд. гіст. навук: 07.00.02 / А.В. Пашкевіч. – Мінск, 2006. – 162 с.
19. Пагарэлы, А. «За новы тып беларуса»: часопіс «25 сакавіка» (1936–1939 гг.) на фоне эпохі / А. Пагарэлы // Arche. – 2014. – № 7–8. – С. 120–194.
20. Грышкевіч, В. Ці існуе крызіс беларускага руху? / В. Грышкевіч // Маладая Беларусь. – 1936. – № 1. – С. 63–67.